ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ РАТЫФІКАЦЫІ ДАГАВОРА АБ ЕЎРАЗІЙСКІМ ЭКАНАМІЧНЫМ САЮЗЕ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў
Ухвалены Саветам Рэспублікі

9 кастрычніка 2014 года
9 кастрычніка 2014 года

Артыкул 1. Ратыфікаваць Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе, падпісаны ў г. Астане 29 мая 2014 года (далей — Дагавор), з наступнай заявай:

«Рэспубліка Беларусь заяўляе, што добрасумленна будзе выконваць свае абавязацельствы ў рамках Дагавора і ажыццявіць іншыя меры па яго рэалізацыі пры ўмове, што да гэтага моманту на трохбаковай або двухбаковай аснове будуць дасягнуты канкрэтныя дамоўленасці аб зняцці бар'ераў, абмежаванняў і канфіскацый ў гандлі асобнымі відамі тавараў і аказанні асобных відаў паслуг, у першую чаргу, у дачыненні да энерганосьбітаў, прадукцыі збораных вытворчасцяў, лібералізацыі аўтамабільных перавозак і іншых адчувальных пазіцый.

Пры гэтым гэтыя дамоўленасці павінны змяшчаць палажэнні аб недапушчальнасці іх пагаршэння ў наступны перыяд да поўнай ліквідацыі канфіскацый і абмежаванняў у Еўразійскім саюзе.».

Артыкул 2. Прызнаць, што страцілі сілу з даты ўступлення ў сілу Дагавора:

1. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Дагавора аб стварэнні адзінай мытнай тэрыторыі і фарміраванні мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 172, 2/1477).

2. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб парадку ўступлення ў сілу міжнародных дагавораў, накіраваных на фарміраванне дагаворна-прававой базы мытнага саюза, выхаду з іх і далучэння да іх» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 172, 2/1478).

3. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіным мытна-тарыфным рэгуляванні» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 173, 2/1480).

4. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных мерах нетарыфнага рэгулявання ў дачыненні да трэціх краін» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 173, 2/1483).

5. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб прымяненні спецыяльных ахоўных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер у дачыненні да трэціх краін» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 174, 2/1482).

6. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб увядзенні мытнай статыстыкі знешняга і ўзаемнага гандлю таварамі мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 174, 2/1487).

7. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб прынцыпах спагнання ўскосных падаткаў пры экспарце і імпарце тавараў, выкананні работ, аказанні паслуг у мытным саюзе» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 174, 2/1488).

8. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб умовах і механізме прымянення тарыфных квот» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 18, 2/1631).

9. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб прадастаўленні тарыфных ільгот» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 18, 2/1632).

10. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб умовах і парадку прымянення ў выключных выпадках ставак уразных мытных пошлін, адрозных ад ставак Адзінага мытнага тарыфу» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 18, 2/1633).

11. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб Сакратарыяце Камісіі мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 18, 2/1635).

12. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб відах мытных працэдур і мытных рэжымаў» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 18, 2/1636).

13. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку дэкларавання тавараў» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 18, 2/1637).

14. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку мытнага афармлення і мытнага кантролю ў дзяржавах — удзельніцах мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 19, 2/1638).

15. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку дэкларавання мытнага кошту тавараў, што перамяшчаюцца праз мытную мяжу мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 19, 2/1639).

16. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку ажыццяўлення кантролю правільнасці вызначэння мытнага кошту тавараў, што перамяшчаюцца праз мытную мяжу мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 19, 2/1640) .

17. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку вылічэння і выплаты мытных плацяжоў у дзяржавах — удзельніцах мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 19, 2/1641).

18. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб абмене інфармацыяй, неабходнай для вызначэння і кантролю мытнага кошту тавараў, паміж мытнымі органамі Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г. , № 19, 2/1642).

19. Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку вядзення і прымянення мер, якія закранаюць знешні гандаль таварамі, на адзінай мытнай тэрыторыі ў дачыненні да трэціх краін» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 19, 2/1662).

20. Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб правілах ліцэнзавання ў сферы знешняга гандлю таварамі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 27, 2/1663).

21. Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб статусе Цэнтра мытнай статыстыкі Камісіі мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 158, 2/1689).

22. Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб парадку перадачы даных статыстыкі знешняга гандлю і статыстыкі ўзаемнага гандлю» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 158, 2/1690).

23. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змен у Пагадненне аб прынцыпах спагнання ўскосных падаткаў пры экспарце і імпарце тавараў, выкананні работ, аказанні паслуг у мытным саюзе ад 25 студзеня 2008 года» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 162, 2/1698).

24. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб парадку спагнання ўскосных падаткаў і механізме кантролю за іх выплатай пры экспарце і імпарце тавараў у мытным саюзе» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1699).

25. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб парадку спагнання ўскосных падаткаў пры выкананні работ, аказанні паслуг у мытным саюзе» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1700).

26. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення мытнага саюза па ветэрынарна-санітарных мерах» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1704).

27. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення мытнага саюза аб каранціне раслін» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1705).

28. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення мытнага саюза па санітарных мерах» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1707).

29. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб абарачэнні прадукцыі, якая падлягае абавязковай ацэнцы (пацвярджэнню) адпаведнасці, на мытнай тэрыторыі мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1711).

30. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб узаемным прызнанні акрэдытацыі органаў па сертыфікацыі (ацэнцы (пацвярджэнню) адпаведнасці) і выпрабавальных лабараторый (цэнтраў), якія выконваюць работы па ацэнцы (пацвярджэнню) адпаведнасці» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1712).

31. Закон Рэспублікі Беларусь ад 2 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб устанаўленні і прымяненні ў мытным саюзе парадку залічэння і размеркавання ўразных мытных пошлін (іншых пошлін, падаткаў і збораў, якія маюць эквівалентнае дзеянне)» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 162, 2/1696).

32. Закон Рэспублікі Беларусь ад 2 лістапада 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Пагадненне мытнага саюза аб каранціне раслін ад 11 снежня 2009 года» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 266, 2/1730).

33. Закон Рэспублікі Беларусь ад 2 лістапада 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Пагадненне мытнага саюза па ветэрынарна-санітарных мерах ад 11 снежня 2009 года» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 266, 2/1731).

34. Закон Рэспублікі Беларусь ад 2 лістапада 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Пагадненне мытнага саюза па санітарных мерах ад 11 снежня 2009 года» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 266, 2/1732).

35. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб узгодненай макраэканамічнай палітыцы» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1757).

36. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб узгодненых прынцыпах валютнай палітыкі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1758).

37. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб стварэнні ўмоў на фінансавых рынках для забеспячэння свабоднага руху капіталу» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1759).

38. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб гандлі паслугамі і інвестыцыях у дзяржавах — удзельніцах Адзінай эканамічнай прасторы» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1760).

39. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку арганізацыі, кіравання, функцыянавання і развіцця агульных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1762).

40. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных прынцыпах і правілах тэхнічнага рэгулявання ў Рэспубліцы Беларусь, Рэспубліцы Казахстан і Расійскай Федэрацыі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1763) .

41. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных правілах давання прамысловых субсідый» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1764).

42. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных правілах дзяржаўнай падтрымкі сельскай гаспадаркі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1765).

43. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных прынцыпах і правілах рэгулявання дзейнасці суб'ектаў натуральных манаполій» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1766).

44. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб правілах доступу да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы транспартавання газу па газатранспартных сістэмах, уключаючы асновы цэнаўтварэння і тарыфнай палітыкі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1767).

45. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб забеспячэнні доступу да паслуг натуральных манаполій у сферы электраэнергетыкі, уключаючы асновы цэнаўтварэння і тарыфнай палітыкі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1768).

46. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных прынцыпах і правілах канкурэнцыі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1769).

47. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных прынцыпах рэгулявання ў сферы аховы і абароны правоў інтэлектуальнай уласнасці» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1770).

48. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб дзяржаўных (муніцыпальных) закупках» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1771).

49. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб рэгуляванні доступу да паслуг чыгуначнага транспарту, уключаючы асновы тарыфнай палітыкі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1772).

50. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб прававым статусе працоўных-мігрантаў і членаў іх сем'яў» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1773).

51. Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 чэрвеня 2011 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб стварэнні, функцыянаванні і развіцці інтэграванай інфармацыйнай сістэмы знешняга і ўзаемнага гандлю мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 65, 2/1824).

52. Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 чэрвеня 2011 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб прымяненні інфармацыйных тэхналогій пры абмене электроннымі дакументамі ў знешнім і ўзаемным гандлі на адзінай мытнай тэрыторыі мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 65, 2/1825).

53. Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 ліпеня 2011 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб асобных часовых выключэннях з рэжыму функцыянавання адзінай мытнай тэрыторыі мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 80, 2/1842).

54. Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2011 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб парадку давання органу, які праводзіць расследаванні, звестак, якія змяшчаюць у тым ліку канфідэнцыйную інфармацыю, для мэтаў расследаванняў, што папярэднічаюць увядзенню спецыяльных ахоўных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер у дачыненні да трэціх краін» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 84, 2/1849).

55. Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2011 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку прымянення спецыяльных ахоўных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер на працягу пераходнага перыяду» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 136, 2/1868).

56. Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2011 года «Аб ратыфікацыі Дагавора аб Еўразійскай эканамічнай камісіі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 141, 2/1876).

57. Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 мая 2012 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб ажыццяўленні транспартнага (аўтамабільнага) кантролю на знешняй мяжы мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012, № 62, 2/1931).

58. Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 ліпеня 2012 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб парадку абмену інфармацыяй, звязанай з выплатай уразных мытных пошлін» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 18.07.2012, 2/1945).

59. Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2012 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Пагадненне аб прымяненні спецыяльных ахоўных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер у дачыненні да трэціх краін ад 25 студзеня 2008 года» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 20.07.2012, 2/1965).

60. Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2012 года «Аб ратыфікацыі Дагавора аб узаемадзеянні ўпаўнаважаных органаў дзяржаў — удзельніц Пагаднення аб узгодненых прынцыпах валютнай палітыкі ад 9 снежня 2010 года, якія ажыццяўляюць валютны кантроль» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.01.2013, 2/2010).

61. Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2014 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Пагадненне аб умовах і механізме прымянення тарыфных квот ад 12 снежня 2008 года» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 19.06.2014, 2/2156).

62. Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2014 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Пратакол аб умовах і парадку прымянення ў выключных выпадках ставак уразных мытных пошлін, адрозных ад ставак Адзінага мытнага тарыфу, ад 12 снежня 2008 года» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 19.06.2014, 2/2157).

63. Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2014 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Пагадненне аб адзіным мытна-тарыфным рэгуляванні ад 25 студзеня 2008 года» (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 19.06.2014, 2/2158).

Артыкул 3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняць захады, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў Дагавора.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА
9 кастрычніка 2014 года, г. Мінск
№ 193—З

■ Погляд

ШТО АДБЫВАЕЦЦА Ў ГАНКОНГУ?

У канцы верасня — пачатку кастрычніка ў Ганконгу прайшлі магутныя вулічныя дэманстрацыі, якія заходнія СМІ тут жа ахрысцілі «рэвалюцыяй руж». У чым прычына цяперашніх пратэстаў у Ганконгу?

Тут мноства фактараў. Перш за ўсё, праблема ў розным успрыманні свету мацерыковым кітайцам і жыхаром Ганконга. У першага вельмі моцныя патрыятычныя пачуцці — ён хоча, каб яго краіна стала вялікай і магутнай, і ўзровень жыцця ў ёй узняўся да ўзроўню таго ж Ганконга праз паступальнае развіццё кітайскай эканомікі. І ў яго няма падстаў для незадаволенасці кіруючай Камуністычнай партыяй, пры якой з 1970-х гадоў узровень жыцця ў краіне вырас разоў у 60-70.

Аднак культурнае, сацыяльнае і палітычнае асяроддзе Ганконга фарміравалася брытанскім урадам. Так, насельнікі горада з'яўляюцца кітайцамі, але кітайцамі дастаткова спецыфічнымі. Яны жылі і выхоўваліся ў зусім іншай культурнай і сацыяльнай парадыгме, якая створана чыноўнікамі брытанскага ўрада і адпавядае нацыянальным інтарэсам Вялікабрытаніі. Людзі вучыліся або ў Вялікабрытаніі, або ў брытанскіх школах на тэрыторыі Ганконга, сталі носьбітамі пэўнага набору заходніх ліберальна-дэмакратычных каштоўнасцяў.

Таксама на менталітэт жыхароў горада вельмі сур'ёзны ўплыў аказалі падзеі 1997 года, калі брытанскі ўрад вярнуў горад Кітаю, не спытаўшы пры гэтым у мясцовага насельніцтва, ці хоча яно вяртацца. Многія гэта ўспрынялі негатыўна, паколькі на момант перадачы горада ўзровень жыцця ў ім быў значна вышэйшы, чым нават у самых паспяховых гарадах мацерыковага Кітая Пекіне і Шанхаі (не кажучы ўжо пра сярэднекітайскі ўзровень у цэлым).

На тэрыторыі горада сканцэнтраваны штаб-кватэры шэрагу найбуйнейшых сусветных транснацыянальных карпарацый. Таму некаторыя жыхары горада палічылі абразай для сябе гэтую перадачу. І ўвесь гэты час яны захоўвалі сімпатыі да таго ладу, які быў пры брытанцах. Усе гэтыя гады напружанасць узмацнялася, і цяпер фактычна выплюхнулася вонкі.

Калі Ганконг вярталі Кітаю, умовы вяртання і «патуранні» для жыхароў Ганконга былі прапісаны вельмі прыблізна. Галоўным лічылі прынцып «адна краіна — дзве сістэмы», а пра канкрэтыку тады неяк не падумалі. Брытанцы, вядома, спрабавалі правесці максімальную колькасць асаблівых правоў для жыхароў Ганконга, але кітайскі ўрад па шэрагу пытанняў адмаўляўся ісці на сур'ёзныя ўступкі.

З іншага боку, Пекін таксама можна і трэба зразумець. Кітайская Народная Рэспубліка не хоча мець на тэрыторыі Ганконга сур'ёзныя праблемы, створаныя выбарам насельніцтвам празаходняга палітычнага дзеяча. Таму Кітай абараняе свае інтарэсы на сваёй спрадвечнай зямлі, пазычанай Вялікабрытаніяй у свой час пры вельмі непрывабных абставінах, і заклікае мясцовае насельніцтва паважаць кітайскія законы.

Увогуле ж жыхарам Ганконга трэба прывыкаць да таго, што яны кітайцы, вучыцца падзяляць каштоўнасці, распаўсюджаныя на тэрыторыі мацерыковага Кітая. Большасць людзей сярэдняга ўзросту, дарэчы, гэта разумее і спрабуе адаптавацца. А вось нонканфармісцкая радыкальная моладзь, якая, як звычайна, хоча ўсё і адразу, адмаўляецца — і выходзіць на вуліцы.

Многія эксперты сцвярджаюць, што пратэсты былі інспіраваны ЗША. Але тут больш важна тое, што гэтую руку бачаць самі кітайцы. Насельніцтва мацерыковага Кітая наогул схільнае ўскладаць на ЗША віну не толькі за хваляванні ў Ганконгу, але і за шэраг іншых негатыўных падзей, што адбываюцца на тэрыторыі Кітая апошнім часам (тэракты ў буйных гарадах, беспарадкі ў Сіньцзян-Уйгурскай аўтаномнай акрузе). Журналісты, палітолагі і звычайныя людзі практычна адзіныя ў думцы, што гэтыя падзеі сталі пакараннем Пекіну за яго спрэчкі з Вашынгтонам у пытаннях сусветнай палітыкі. У прыватнасці, Ганконг стаў помстай за тое, што ў апошнія месяцы Кітай занадта цесна збліжаецца з Расійскай Федэрацыяй.

Што да рэальнасці, то, вядома, з пункта гледжання класічнай геапалітыкі Злучаным Штатам і Вялікабрытаніі выгадна інспіраваць беспарадкі на тэрыторыі Кітая. КНР развіваецца так добра і так паспяхова, што гэта выклікае панічны страх у заходніх урадаў.

Так, амерыканцы ўсур'ёз асцерагаюцца за сваю палітычную будучыню, і не толькі ў рэгіёне Усходняй Азіі, але і ў свеце ў цэлым. І ўлічваючы, што ў пытаннях знешняй палітыкі ні Вашынгтон, ні Лондан ніколі асабліва не саромеліся сумніўных метадаў, я не буду моцна здзіўлены, калі яны насамрэч прыклалі руку да распальвання ўнутранага канфлікту ў Ганконгу праз мясцовыя фонды або сродкі масавай інфармацыі. Такім чынам яны спрабуюць трывожыць канкурэнта і ствараць унутраныя перашкоды на шляху яго развіцця і экспансіі.

Але калі паглядзець на сітуацыю са стратэгічнага пункту гледжання, то амерыканцам і брытанцам не трэба было б удзельнічаць у ганконгскіх падзеях або іншых беспарадках на тэрыторыі Кітая, не кажучы ўжо пра тое, каб інспіраваць іх. Усё гэта выклікае вельмі сур'ёзнае раздражненне ў кітайскай эліты і насельніцтва, перашкаджае збліжэнню паміж Кітаем і Захадам і робіць узвышэнне Паднябеснай вельмі небяспечным для ЗША і Еўропы працэсам.

Нарэшце, падзеі ў Ганконгу могуць замарудзіць працэс палітычнай рэформы ў Кітаі, што таксама не ў інтарэсах Захаду. Пекіну важна не проста ўкараняць на тэрыторыі Кітая нейкія абстрактныя дэмакратычныя працэдуры, а рабіць гэта акуратна і паступова, каб працэс узвышэння Кітая не быў спынены. І калі на прыкладзе Ганконга Кітай убачыць, што працэс дэмакратызацыі можа страціць кіравальнасць і павышае рызыку дэстабілізацыі краіны, то ён перагледзіць свой падыход.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

■ Не прапусціце!

100 гадоў пасля Першай сусветнай

У МАГІЛЁВЕ СТВАРЫЛІ ЎНІКАЛЬНУЮ ПЕРАСОВАЧНУЮ ВЫСТАВУ, ПРЫСВЕЧАНУЮ ПАДЗЕЯМ ВЯЛІКАЙ ВАЙНЫ 1914-1918 ГАДОЎ НА ЎСХОДЗЕ БЕЛАРУСІ

Такая колькасць малавядомых фактаў аб Першай сусветнай вайне, у якой удзельнічалі 38 дзяржаў і на палях якой змагаліся звыш 70 мільёнаў чалавек, сабрана ўпершыню. У аснову выставы пакладзены звесткі яшчэ не выдадзенай кнігі магілёўскага пісьменніка, кіраўніка гісторыка-патрыятычнага пошукавага атрада «Вікру» Мікалая Барысенкі «Рэха Вялікай вайны на Усходзе Беларусі». На ёй прадстаўлены рэдкія фота і дакументы з расійскіх архіваў.

— У той час у склад Магілёўскай губерні ўваходзілі сучасныя Гомельская вобласць і частка Віцебскай, — кажа аўтар. — Гэта быў тылавы раён арміі Расійскай імперыі. Вядома, што тут знаходзілася не менш за 25 шпіталяў, праз губерню праходзілі сотні тысяч бежанцаў. Шмат імён нашых землякоў, якія дэманстравалі прыклады сапраўднай мужнасці на той вайне, несправядліва забытыя. Сёння вядомы імёны толькі 160 Георгіеўскіх кавалераў, ураджэнцаў губерні, з іх 36 — поўных і 2 — уладальнікаў «поўных бантаў». Мы жывём у горадзе, дзе знаходзілася стаўка Мікалая II, але не можам пахваліцца добрым веданнем падзей таго перыяду. І тое, што можна ўбачыць на выставе, для многіх стане сапраўдным адкрыццём.

Перасовачная выстава пабывае ва ўсіх школах Магілёўшчыны. Але гэта толькі невялікая частка той інфармацыі, якая прадстаўлена ў кнізе Мікалая Барысенкі. На жаль, яна пакуль існуе ў адзіным экзэмпляры, і тое камп'ютарным. Затрымка толькі за спонсарам, які не пашкадаваў бы сродкаў на гэта ўнікальнае выданне.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■ Ну і ну!

Выхадная дапамога — мільярд!

Выхадныя дапамогі — да 1 мільярда рублёў — такія «бонусы» атрымлівалі члены ліквідацыйнай камісіі прадпрыемства. Яны, як высветлілі рэвізоры, наогул стараліся максімальна прадоўжыць тэрміны ліквідацыі. Пры гэтым не спяшаліся выплачваць даўгі.

— Гандлёва -вытворчае закрытае акцыянернае таварыства «Палярыс», пачынаючы з 2008 года па рашэнні ўласнікаў — у стадыі ліквідацыі. Пры гэтым ажыццяўлялася забароненая прадпрымальніцкая дзейнасць, не звязаная з ліквідацыяй. Аказваліся паслугі аўтамабільных стаянак і ажыццяўлялася здача ўнаём нерухомасці таварыства. І рабілася гэта пад кіраўніцтвам старшыні ліквідацыйнай камісіі. Ён жа — заснавальнік прадпрыемства і былы дырэктар, — паведамілі «Звяздзе» ва ўпраўленні Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Віцебскай вобласці.

У выніку ў 2011—2014 гг. фірма атрымала даход — 4,7 млрд рублёў. Пры гэтым мела запазычанасць — каля 19 млрд — перад рознымі суб'ектамі гаспадарання і грамадзянамі... Замест таго, каб «выплачваць па рахунках», «ліквідатары» атрымлівалі добрыя грошы.

Выхадныя дапамогі членам ліквідацыйнай камісіі сёлета склалі ад 250 мільёнаў да 1 мільярда рублёў — у залежнасці ад стажу працы і займаемай пасады, — удакладніў **Юрый ШЫРАКОЎ, намеснік начальніка вышэйзгаданага ўпраўлення.**

Па матэрыялах праверкі эканамічны суд Віцебскай вобласці прыцягнуў камерцыйную структуру да адміністрацыйнай адказнасці — штрафу ў памеры 50 базавых велічынь (7,5 млн рублёў. — **Аўт.**). Быў канфіскаваны і незаконна атрыманы даход — больш за 4 млрд рублёў. Між іншым адпаведную судовую пастанову фірма абскардзіла ў Вярхоўным Судзе. Але па выніках разгляду скаргі пастанову пакінулі ў сіле ў поўным аб'ёме.

Аляксандр ПУКШАНСКІ